*М. А. Бяспалая,*
*доктар гістарычных навук, прафесар,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# ДУХОЎНА-МАРАЛЬНЫЯ ВЫТОКІ ПАТРЫЯТЫЗМУ

Аб патрыятызме, яго праяўленнях, унутраных асновах напісана шмат розных відаў літаратуры: ад раманаў і манаграфій да вершаў і навуковых артыкулаў. Гэта тэма прысутнічае ў фальклоры – казках, паданнях, прыказках, песнях і інш. Яна не можа быць вычарпана, таму што ў кожнага сваё ўяўленне аб сутнасці патрыятызму, розных формах яго праяўлення, у кожнага свае прыклады патрыятычных паводзін у пэўнай сітуацыі. Аднак для ваеннага і пасляваенных пакаленняў былога СССР і сучасных суверэнных дзяржаў прыкладам масавага патрыятызму былі і застаюцца падзеі Вялікай Айчыннай вайны.

Вельмі доўгі час па-за калектыўнай памяццю народа таілася трагедыя тых, хто па самых розных прычынах і абставінах апынуўся ў нямецкім палоне.

Згодна з апошнімі данымі, палонных байцоў Чырвонай арміі налічвалася 5 163 381, з іх дажылі да вызвалення 1 034 220, удалося ўцячы 66 694, загінулі (расстраляны ці памерлі ад голаду і здзекаў) 3 226 237, вызвалены ў розны час 823 230 [1, с. 139]. За кожнай лічбай хаваецца трагедыя канкрэтнага чалавека, прозвішчы многіх засталіся невядомымі і па сёння. Як, напрыклад, мабыць, ніколі не будзе ўстаноўлена асоба юнака, які, трэба меркаваць, ці папаў у палон, ці быў вывезены ў Германію, працаваў там на шахце і вёў дастаткова падрабязны дзённік; падчас вяртання на Радзіму, у чэрвені 1945 г., аўтар дзённіка хутчэй за ўсё пазбавіўся ад такой кампраметуючай яго рэчы ці, можа, проста згубіў. На Таварнай станцыі ў Мінску дзённік знайшоў супрацоўнік на той час Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна С. І. Багадзін і перадаў у Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Першы запіс у дзённіку зроблены ў маі 1942 г., апошні ў студзені 1943 г. Напісаны ён адукаваным маладым чалавекам, ёсць шмат бытавых дэталяў аб умовах нямецкага палону. Але сярод іх сустракаюцца няўмелыя вершы як крык душы чалавека, які не можа пабачыць Радзіму, аб якой вельмі сумуе. Выкарыстаем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

некалькі радкоў на мове арыгінала: «Зеленые поля и леса И адская жизнь моя, Покинуть бы вас скорей и на Родине быть моей» і яшчэ: «Ох, как запеклось сердце. За что так должны мы страдать? В чем виноваты мы? Ну придет же и обратная пора» [2, воп. 10466].

У апошнія дзесяцігоддзі пачалі прысвячацца савецкім ваеннапалонным навуковыя працы, у якіх разглядаюцца асноўныя кірункі палітыкі нямецкіх акупацыйных улад у адносінах да вязняў, раскрываюцца ўмовы іх утрымання, арганізацыя аховы і іншыя аспекты функцыянавання лагераў для ваеннапалонных, так званых шталагаў і дулагаў. Адлюстроўваецца самы галоўны момант – наяўнасць сярод ваеннапалонных разнастайных форм супраціўлення: распаўсюджванне лістовак, сабатаж, уцёкі, паўстанні і г.д., што яскрава сведчыць аб непакорнасці многіх вязняў абставінам, іх мужнасці і стойкасці.

Перш чым перайсці да разгляду гэтага аспекту, спынімся на арганізацыйных момантах у дзейнасці сістэмы лагераў для ваеннапалонных. На наш погляд, яны вельмі важныя і выразна адлюстроўваюць сутнасць нацысцкай палітыкі генацыду. Па-першае, ахову лагераў для ваеннапалонных ажыццяўляў вермахт, падпарадкоўваліся яны таксама камандаванню вермахта. Аднак адносіны салдат аднаго ваюючага боку да салдат другога не былі гуманнымі, аб чым сведчыць масавая смяротнасць сярод вязняў. Напрыклад, па шталагу № 352, што знаходзіўся ў Масюкоўшчыне (на тым месцы зараз стаіць помнік), смяротнасць была наступная: за студзень 1942 г. памерлі 1711 чалавек, за люты – 1173, за сакавік – 495 і г. д. [2, воп. 23917, 23921].

На падставе гэтых лічбаў можна сказаць і наступнае: абыходжанне з савецкімі (і не толькі) ваеннапалоннымі дэманстравала ігнараванне міжнародных канвенцый аб адносінах да ваеннапалонных: перш за ўсё ўлічваліся ваенна-палітычныя мэты Германіі, дасягненне якіх было магчыма толькі з улікам расавых і палітычных прынцыпаў, што пачалі ўжывацца нямецкімі ўладамі з першых дзён вайны. Калі галоўнакамандуючаму сіламі вермахта фельдмаршалу Кейтэлю ў жніўні 1941 г. адзін з шэфаў ваеннай разведкі выказаў неўразуменне наконт правамернасці прымянення здзекаў над ваеннапалоннымі, ён адказаў апаненту, што такія пярэчанні «адпавядаюць салдацкаму ўспрыманню рыцарскай вайны. Тут жа размова ідзе аб знішчэнні светаўспрымання», пагэтаму: «… я згодны з мерапрыемствамі і настойваю на іх» [1, с. 34]. Такім чынам, галоўнае камандаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вермахта давала «дабро» на здзекі, масавыя забойствы і іншыя формы знішчэння ваеннапалонных, асабліва савецкіх, у імя мэт Вялікай Германіі.

Аднак самае хвалюючае, на наш погляд, заключаецца ў тым, што многія з вязняў нацысцкіх лагераў даказалі сваімі паводзінамі ў фашысцкім палоне агульначалавечую ісціну: чалавеку дадзена права выбару. Нягледзячы на нечалавечыя ўмовы ўтрымання, фізічныя і маральныя здзекі многія байцы і афіцэры Чырвонай арміі змаглі знайсці ўнутраныя сілы процістаяць гэтаму найвялікшаму злу XX ст., не згубіць годнасць і гонар.

Праўда, многія факты такога няроўнага процістаяння супрацьлеглых прынцыпаў доўгі час замоўчваліся афіцыйна, ды і людзі, прайшоўшыя фашысцкія лагеры, не вельмі спяшаліся падзяліцца сваім страшным мінулым.

Аднак дайшлі да нас сведчанні аб тых жудасных падзеях ва ўспамінах ідавочцаў, былых ваеннапалонных, якім пашчасціла ўцячы. Рознымі шляхамі гэтыя звесткі трапілі і захаваліся ў архівах ці музейных фондах. У пэўным сэнсе ўспаміны не зусім дакладныя, тым не менш агульная карціна атрымоўваецца дастаткова выразная.

Прызнана, што на тэрыторыі Беларусі ўтрымлівалася каля аднаго мільёна ваеннапалонных, з іх прыкладна 800 тыс. загінулі. Адзін з жыхароў Мінска ўспамінаў, як стварыўся лагер ужо ў ліпені-жніўні 1941 г. на Лагойскім тракце (цяпер вул. Я. Коласа) на тэрыторыі вайсковых казарм. У кастрычніку сюды прыбыла вялікая група ваеннапалонных, у казармах месца не хапала, частка людзей заставалася пад восеньскім, а потым зімовым небам. Ваеннапалонныя вазілі саматуж ваду, на абпал разбіралі будынак школы, калі-нікалі мясцовыя жыхары перадавалі ежу. Лагер дзейнічаў да 1943 г. [2, воп. 23634]. Самыя жудасныя лагеры для ваеннапалонных існавалі ў Масюкоўшчыне (шталаг № 352), каля Маладзечна (шталаг № 342), каля Докшыц (шталаг № 351), каля Баранавіч (шталаг № 337).

Адной з распаўсюджаных форм супраціўлення ў лагерах былі ўцёкі вязняў. На тэрыторыі Беларусі з лагераў уцяклі прыкладна 19 тыс. чалавек, з іх 13,5 тыс. сталі партызанамі, прычым 9 % камандзіраў, камісараў і начальнікаў штабоў партызанскіх брыгад і 14,31 % каманднага саставу партызанскіх атрадаў склалі былыя ваеннапалонныя [1, с. 73]. У фондах Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захаваліся ўспаміны І.М.Фёдарава, які перад вайной служыў у Беларусі. Вайна застала яго 24-ю дывізію

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каля Ліды, 30 чэрвеня яна папала ў акружэнне. З баямі астаткі дывізіі прабіваліся на ўсход, у баях на р.Бярэзіна ён быў цяжка паранены і папаў у палон. Знаходзіўся спачатку ў лагеры ў Драздах, потым Масюкоўшчыне. Жыццём абавязаны ваеннапалоннаму доктару Свірыдаву, які не толькі лячыў, але змог трохі палепшыць харчаванне параненым. Акрыяўшы, І. М. Фёдараў і чатыры яго сябры дамовіліся аб уцёку, што і здзейснілі 22 сакавіка 1942 г. падчас прымусовых работ за межамі лагера. Яны перабілі канвой, захапілі зброю, вызвалілі яшчэ 8 чалавек і знайшлі прытулак у Лагойскіх лясах. Гэтая група стала ядром партызанскага атрада, а потым брыгады «Штурмавая». І. М. Фёдараў пасля вайны ўзначальваў абласны інстытут удасканалення настаўнікаў [2, воп. 10466].

Не толькі адчай, але і іншыя пачуцці – смеласць, прадбачлівасць, рызыка – рухалі вязнямі лагераў у пошуках выйсця. Найбольш выразнай формай супраціўлення ваеннапалонных былі паўстанні, якія адбыліся ў многіх лагерах. Напрыклад, у раёне Глыбокага ў ноч на 7 лістапада 1941 г. з лагера ўцяклі вязні, якія, хто меў сілы, накінуліся на лагерную ахову і перабілі яе.

Адной з малавядомых старонак народнага супраціўлення доўгі час заставалася падрыхтоўка паўстання ў акупіраваным немцамі Мінску, якое планавалася пачаць 4 студзеня 1942 г. Яно рыхтавалася сумесна падпольшчыкамі, партызанамі, ваеннапалоннымі, меркавалася, што пачнецца аднасова ў розных частках горада – ваенных лазарэтах і лагерах. Быў распрацаваны план вываду са строю тэлефоннай сувязі, адначасовай атакі на будынкі камендатуры, паліцыі, акруговага камісарыята… і на ўсе лагеры ваеннапалонных. Былі складзены карты горада і яго ваколіц з ваеннымі аб’ектамі, назапашана зброя (звыш 400 адзінак, у тым ліку вінтоўкі, гранаты, нават кулямёты, і 3000 баявых патронаў), падрыхтавана ўдарная група з 300 чал. Прадугледжвалася вызваліць усіх ваеннапалонных і ў 20 км ад Мінска сустрэцца з партызанамі.

Аднак нямецкай агентуры ўдалося раскрыць падрыхтоўку паўстання, было арыштавана больш за 400 чал., 27 адразу расстраляны. Удзельнікі распрацоўкі плана, якім пашчасціла застацца ў жывых, лічылі, што калі б агентура не змагла даведацца аб паўстанні, то яно ўдалося б на 100 % [1, с. 51].

Лічым магчымым звярнуць увагу чытачоў на артыкул М. Качука ў газеце «Советская Белоруссия» за 29 і 30 сакавіка 2013 г. пад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

назваю «Без вести не пропавший». На падставе дакументаў, успамінаў, навуковых распрацовак аўтар распавядае аб трагічным лёсе нашага земляка, К. М. Чубчанкова, і яго сяброў – лётчыкаў, якія трапілі ў нямецкі палон і не скарыліся абставінам. Наадварот, праявілі самыя лепшыя чалавечыя якасці – мужнасць, вытрымку, стойкасць, не адступілі перад выпрабаваннямі і небяспекай і павялі за сабой іншых.

На адным эпізодзе з артыкула М. Качука дазволім сабе спыніцца: ён не толькі малавядомы, але трагічна-жахлівы і ў той жа час велічна-трагічны. … У нацысцкім лагеры смерці Маўтхаўзен (Аўстрыя) у 1944 г. быў створаны спецыяльны «блок смерці», куды змяшчаліся ваеннапалонныя савецкія афіцэры за спробы ўцёкаў з іншых лагераў. Так, у 1945 г. вязні (агульная колькасць каля 700 чал.), разумеючы, што іх чакае, пачалі рыхтаваць паўстанне, якое прызначылі на 29 студзеня; ахвяруючы жыццём, адзін з іх нават раздабыў план лагера. Былі створаны штурмавыя групы, распрацаваны план захопу лагера. Аднак 27 студзеня схапілі кіраўнікоў паўстання – 25 чал., сярод іх і К. М. Чубчанкова, і пакаралі смерцю. Нягледзячы на гэтую трагедыю, ноччу 2 лютага вязні пайшлі на штурм, многія загінулі адразу, каля 400 змаглі вырвацца. Далей працытуем радкі з артыкула на мове арыгінала: «Началось невероятное по своей жестокости истребление советских военнопленных, цинично названное “Охота на зайцев”. Кровь лилась рекой… Советских офицеров убивали из охотничьих ружей, рубили топорами, резали ножами… Через несколько дней все было кончено – 410 обезображенных трупов свалили на школьном дворе… Нашлись среди австрийцев и люди – три семьи, которые, рискуя угодить за это в лагерь, спрятали и спасли четверых советских офицеров…»

Прайшлі дзесяцігоддзі, і ў Аўстрыі былі сабраны сродкі на помнік – ушанаванне ахвяр паўстання, аб якім зняты мастацкі і дакументальны фільмы; вядзецца навуковае даследаванне дакументаў аб лагеры і лёсе яго вязняў.

У нашай краіне працэс ушанавання памяці вязняў фашысцкіх лагераў паступова пачаў разгортвацца з другой паловы 1950-х гг. На месцы большасці лагераў пастаўлены помнікі, зроблены адпаведныя шыльды, гарыць вечны агонь. Аднак трэба прызнаць, што ведаем мы яшчэ, на жаль, мала аб лепшых якасцях чалавечай душы, якія былі праяўлены салдатамі, афіцэрамі Чырвонай арміі і ў нямецкім палоне і якія можна лічыць адбіткам глыбокага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрыятычнага пачуцця.

---

1. *Докунова, Е. Н.* Советские военнопленные на оккупированной территории Беларуси : условия содержания, сопротивление (1941–1944) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Е. Н. Докунова ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2013. – 146 л.

2. *Фонды* Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ